**ДУА “Пагост – Загародская дзяржаўная сярэдняя  школа**
**імя славянскіх асветнікаў Кірыла і Мяфодзія” Пінскага раёна**

# Аб чым спявае бабулін ручнік?

Аўтар: ……………., вучань 4 класа
Кіраўнік: Мелюх Таццяна Мікалаеўна,
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай
кваліфікацыйнай катэгорыі
Тэл.: +375444553952

# УВОДЗІНЫ

“Беларусь, Беларусь,
Дорыш людзям красу.
Беларусь, Беларусь,
Цябе ў сэрцы нясу.”

“Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, дый не патрэбна”, – так сказаў шчыры патрыёт сваёй Радзімы Уладзімір Караткевіч.

Чаму нашу Радзіму называюць Белай Руссю? Існуе некалькі тлумачэнняў. Адны лічаць, што наша зямля атрымала такую назву, бо не была заваяваная іншаземцамі (белая – значыць чыстая, вольная, незалежная). Другія мяркуюць, што белае льняное адзенне, светлыя валасы нашых продкаў паслужылі для яе назвы. А можа, зямля стала так называцца ад ручнікоў, разасланых па берагах рэчак і азёраў, якія ад сонца і вады станавіліся бялюткімі-бялюткімі? Ад тых палатняных белых ручнікоў-крылаў, што ў кожнай нашай хаце[2, с. 350].

Вывучаць, пазнаваць, разумець сваю зямлю, яе народ, бадай, самая галоўная наша задача. Нашы вочы і душы здольныя не проста бачыць прыгажосць, адчуваць гармонію сусвету – мы рукамі сваімі ўмеем рабіць свет прыгажэйшым. Тканыя, вышываныя ручнікі, якія можна назваць рукатворнымі летапісамі душ, памкнёных да прыгажосці, сталі сімваламі беларускай нацыі, і імі мы можам ганарыцца нароўні з Белавежскай пушчай ці Нацыянальнай бібліятэкай.

Ручнік адлюстроўвае гісторыю народа, яго дух, творчыя памкненні і мастацкае светаўспрыманне. Гэта найкаштоўнейшы здабытак беларускай культуры і мастацтва.

Нашы продкі былі мудрымі і дабрадушнымі людзьмі. Яны ведалі мноства абрадаў і звычаяў, як запаведзі выконвалі іх у сваім паўсядзённым жыцці. Мы старанна забываем сваю гісторыю, сваі традыцыі на працягу многіх гадоў.

Ва ўзорах тканых і вышываных вырабаў зашыфравана гісторыя жыцця людзей і прыроды, гісторыя роднага краю [6,с.68].

Маёй матулі ў спадчыну ад маёй бабулі засталося вельмі шмат ручнікоў з рознымі малюнкамі. Мяне зацікавіў той момант, што кожны ручнік мае асабісты малюнак і асаблівасці ў прымяненні.

Пагаварыўшы на інфармацыйнай гадзіне аб беларускіх ручніках і арнаменце я зрабіў вывад, што ніхто з аднакласнікаў не ведае, што ж абазначае арнамент вышыты на ручніках. Праблема ў тым, што навучэнцы не ведаюць, што такое беларускі ручнік, што такое арнамент. Але ж многія з іх карыстаюцца імі ў паўсядзённым жыцці.

Я лічу, што дадзеная тэма актуальна для таго, каб я і мае аднакласнікі і людзі наогул не забывалі сваю спадчыну.

Актуальнасць дадзенай праблемы дазволіла нам сфармуліраваць наступную тэму даследавання: “Аб чым спявае бабулін ручнік”.

Аб’ектамі даследавання сталі беларускія нацыянальныя ручнікі і арнамент, вышыты на іх.

Прадмет даследавання: вывучэнне, як у нашай мясцовасці адлюстраваліся элементы арнамента на матэрыяле ручнікоў.

Мэта: даследаваць, як выкарыстоўваюць і прымяняюць беларускія ручнікі ў розных жыццёвых выпадках.

У адпаведнасці з указанай мэтай былі пастаўлены наступныя задачы:

1. пазнаёміцца з літаратурай і матэрыяламі інтэрнэта;
2. знайсці майстрыц, запісаць іх расказы;
3. пазнаёміцца з выкарыстаннем ручнікоў у сем’ях маіх аднакласнікаў;
4. выклікаць цікавасць у вучняў класа даследаваць і вывучаць спадчыну нашых продкаў;
5. прапанаваць настаўнікам распрацоўкі класных і інфармацыйных гадзін па выхаванню павагі да традыцый народнага мастацтва.

Актуальным засталося пытанне: ці выкарыстоўваюць людзі ў сучасны час у паўсядзённым жыцці беларускія вышываныя ручнікі? Даследаванне праводзілася на працягу першай і другой чвэрці.

Працуя над праблемай, прымяняліся наступныя метады: анкетаванне навучэнцаў 4 класа, інтэрв’ю, славесны, пашуковы, даследча-навуковы.

# ГЛАВА 1 УЗАЕМАСУВЯЗЬ БЕЛАРУСКАГА АРНАМЕНТУ З БЕЛАРУСКІМ РУЧНІКОМ

## 1.1 Ручнік і яго віды

Ручнік − рэч глыбока сімвалічная, шматзначная. Вышываная, узорыста вытканая тканіна выклікае ў нас шмат пачуццяў і асацыяцый. Створаны па законах мастацтва, ручнік упрыгожвае побыт і адначасова з’яўляецца сімвалічным напамінам пра нябачныя сувязі, што знітоўваюць асобнага чалавека з Богам, родам, продкамі. Сваёй прысутнасцю ў хатнім чырвоным куце ці ў царкве на абразах, на прыдарожным ці надмагільным крыжы ручнік адзначае тую прастору, у якой чалавек праз словы малітвы здольны ўзняцца да спасціжэння складаных сувязей з Сусветам.

Ручнік адлюстроўвае гісторыю народа, яго дух, творчыя памкненні і мастацкае светаўспрыманне. Гэта найкаштоўнейшы здабытак беларускай культуры і мастацтва[8, с. 327].

Ва ўзорах тканых і вышываных вырабаў зашыфравана гісторыя жыцця людзей і прыроды, гісторыя роднага краю. Ёсць такая легенда: напрыканцы XII ст. на землі Беларусі абрушылася крыжацкая навала. Крыжакоў на адкрытых прасторах перамагчы было вельмі цяжка, практычна немагчыма. Але нашы продкі, як тыя партызаны, хаваліся ў лесе. Яны слалі ручнікі ў выглядзе сцежкі на балоцістай глебе і заманьвалі туды ворагаў. А ў крыжакоў былі на ботах шпоры, і калі яны праходзілі па гэтых ручніках, то чапляліся шпорамі за іх і падалі.  З засады выскаквалі воіны і з лёгкасцю бралі ворагаў у палон.

Канкрэтныя знаходкі ручніка датуюцца перыядам Кіеўскай Русі. Ён быў звычайным для тагачаснага побыту прадметам. Яго ўжо тады арнаментавалі і заўсёды ставіліся да палатніны з пашанай. Варта прыгадаць кіеўскі скарб, знойдзены ў 1876 г., які складаўся са 120 сярэбраных манет часоў Старажытнай Русі. Без сумнення, яны апынуліся ў зямлі з прычыны татарскай навалы, таму і былі спехам закапаны, абгорнутыя толькі тканінай. Ёю аказаўся вышыты ручнік, сатлелыя рэшткі якога і выцягнулі з глебы разам з манетамі. Шчасліваму захаванню палатніны ў дадзеным выпадку садзейнічала знаходжанне яе са значнай колькасцю металічных, тым больш сярэбраных рэчаў[1,с.208].

Як выглядаў старажытны беларускі ручнік? Ён быў трошкі меншы па сваіх памерах за сучасны, вырабляўся нескладанымі спосабамі ткацтва, а калі арнаментаваўся, то пераважна шыццём. У колеравых адносінах пераважалі шэра-белыя ці прыглушаныя чырвона-карычневыя адценні льнянога прадзіва.

Больш дакладныя звесткі пра беларускі ручнік пакінула Сярэднявечча. Ручнік згадваецца ў дакументах гарадскіх судоў Мінска, Магілёва, Брэста, Гродна, Вільні, Слоніма, Віцебска і іншых гарадоў як адзін з папулярных прадметаў гарадскога і сялянскага побыту. Тады карысталіся простымі ўціральнікамі і ўзорыста вышыванымі ручнікамі з хатняга палатна. Яны складалі пасаг і вясковай, і гарадской дзяўчыны. У той час ручнік набыў адзнакі

каштоўнай дэкаратыўнай рэчы і разам з іншымі мастацкімі тканінамі з'яўляўся прадметам гандлю. Тая акалічнасць, што беларусы ведалі ручнікі і блізкіх, і даволі далёкіх заходнееўрапейскіх краін, не перашкаджала ім трымацца свайго ўласнага арнаментальна-каляровага стылю, які адразу ж выдаваў “полотенце шитое литовское”.

Падобны выраб адлюстраваны на гравюры “Ф. Скарына”, змешчанай у Бібліі 1517 − 1519 гг., дзе вядомы асветнік паказаны за маленькім рабочым столікам, пакрытым багата арнаментаваным ручнікам. Наяўнасць ручніка, ды яшчэ ў цэнтральнай частцы гравюры, наўрад ці выпадковая. Трэба думаць, што наш славуты першадрукар быў добра знаёмы з культурай сваёй зямлі. Таму тканіна на гравюры сканцэнтравана перадае выразныя рысы беларускага ручніка: ромба-геаметрычны арнамент, скампанаванасць яго ў папярочныя палосы, разбеленасць фонам, доўгія махры. Асаблівасці аздаблення палатна паказаны старанна і досыць рэалістычна, тут угадваецца стылістыка вырабаў паўночна-ўсходняй Беларусі.

У залежнасці ад прызначэння і функцыі ручнікі маюць розныя назвы. Ручнікі ўтылітарныя паўсюдна на Беларусі называюцца ўціральнік, уцірач, уцірка − кавалак тканіны без дэкору ці з вузенькімі палоскамі-ператыкамі па краях, які выкарыстоўваюць для побытавых патрэб (імі ў паўсядзённым жыцці выціралі рукі і твар). Прычым на патрэбу сям'і выдзяляўся толькі адзін ручнік, які звычайна вісеў па сярэдзіне сцяны. У лазню яго не бралі.

Да ліку ручнікоў утылітарнага прызначэння належаў скарач, ці трапкач, пацірач (на Палессі), ці брэндзал (на паўночным захадзе) – маленькі, квадратнай ці падоўжанай формы, неад'емнай прыналежнасцю якога былі доўгія махры, часам акуратна спавітыя прыгожымі шнурамі-кутасамі. Скарачы, звычайна больш складаныя за ўціральнік па каларыце, спосабах выканання, ніколі не ткаліся асобным вырабам, а адразаліся ад простага ці ўзорыстага палатна. Яны ўжываліся для выцірання посуду, рук, а пругка сплеценымі кутасамі імі “на скорую руку білі дзяцей”. Галоўная ж функцыя такога ручніка– зручная, лёгкая і танная прылада для пераносу керамічнага посуду з ежай. Сабраныя наверсе вакол пасудзіны доўгія махры ўтваралі ручку, што дазваляла зручна пераносіць палявыя гаршкі з хаты на сенажаць ці жніво[4, с. 298].

Самым высокім статутам надзяляліся абрадавыя (рытуальныя) ручнікі, багата аздобленыя натыканнем, вышыўкай, карункамі. Абрадавыя ручнікі выкарыстоўвалі ў святы і ў абрадах. Яны былі ўпрыгожаны арнаментальнай вышыўкай з кветак, геаметрычных сімвалаў (круг, крыж, ромб) і чароўных птушак. У якасці фарбаў для пражы выкарыстоўвалі расліны. Чорны колер атрымлівалі пры дапамозе бабоўніку ці змешвалі сок буракоў з настоем кары вольхі. Чырвоны рабілі з настою валошкі, адвару сырой мацярдушкі, адвару сырой кары рабіны. Для зялёнага колеру выкарыстоўвалі лісты бярозы, адвар з сырых лістоў каманімніка. Ручнікі для падарункаў мелі назву платкі, спецыяльна прызначаныя для выканання пэўнага абраду – абыдзеннікі. Відазмененай формай абрадавага ручніка быў і надзежнік – палатняная накрыўка для дзяжы. Яго таксама выкарыстоўвалі на ўрачыстым паднашэнні

гасцям каравая з хлебам-соллю. Увогуле, гэта адзін са шматлікіх прыкладаў найцяснейшай сувязі ручніка з хлебам, якая праглядаецца скрозь усю сямейную і каляндарную абраднасць беларусаў.

Яшчэ адным відам ручнікоў была намітка – своеасаблівы галаўны ўбор беларускіх жанчын. Канцы ручніка намотвалі, завівалі, мудрагеліста абкручвалі вакол галавы, пакідаючы свабодным толькі твар. У беларусаў намітка лічыцца адным з самых архаічных прадметаў жаночага строю.

Ручніковая тканіна, прызначаная для ўпрыгожвання абразоў і бажніц, называлася набожнік. Злучанасць гэтай рэчы з абразамі, з чырвоным кутом адлюстравана ў лакальных назвах: набразнік, абразны ручнік, накутнік, багавік, завеска, плат, платок, набожны платок. Ён вылучаўся выразнай дэкаратыўнасцю і пэўнай даўжынёй, якая вар'іравалася ад 2 да 5 метраў у залежнасці ад памераў бажніцы і колькасці абразоў. Пакрывалі бажніцу звычайна адным суцэльным вырабам, іншы раз вылучаючы галоўны абраз асобным, найлепш аздобленым набожнікам[7, с. 167].

Аброчныя (запаветныя) ручнікі, ці ручнікі-абярэгі, прыносяць па абяцанні ці запавеце на абракальныя, прыдарожныя і раскрэсныя крыжы, прошчы, святыя крыніцы, святыя дрэвы як ахвяру, дар, сродак усталявання чалавекам кантакту з вышэйшым светам, індывідуальную просьбу да Бога. Выраблялі спецыяльныя аброчныя ручнікі, якія ахвяравалі ў царкву ці касцёл, капліцу ў крызісныя сітуацыі (засуха, эпідэмія, вайна, хваробы дзяцей). На Палессі многія жанчыны ткалі спецыяльныя ручнікі-абярэгі для ўсёй сям'і. Гэтыя ручнікі трымалі за абразамі, але пры неабходнасці бралі з сабой у далёкую дарогу. Ручнікі-абярэгі пераходзілі з роду ў род, з пакалення ў пакаленне. У многіх сем'ях яны жывуць і па сённяшні дзень.

Ручнік, бясспрэчна, быў радавым абярэгам, а ў сучасным разуменні ўвасабляў ідэю сцяга.  Гэтае ахоўнае покрыва збірала пад сваю апеку ўвесь род, прычым лічылася, што магічная сіла разлівалася не толькі на жывых, але і на памерлых суродзічаў.  Ручнік паўставаў сімвалам адзінства, знакам аб'яднання ў межах роду, а пазней сямейнай сацыяльнай групы, урэшце знакам групавой сілы, а менавіта, здольнасці абараніць блізкіх. І толькі з зацямненнем першапачатковай сімволікі ручніка ўвага была перанесена на дэкаратыўна-мастацкую значнасць палатніны.

Адной з важных характарыстык ручніка быў яго колер. Як правіла, ручнік меў два асноўныя колеры – чырвоны і белы, прычым узоры чырвоных палёў ручніка былі сіметрычныя ў адносінах адзін да аднаго. У традыцыйнай культуры славян белы колер сімвалізаваў пераход з аднаго стану ў другі. Чырвоны адпавядаў стабільнасці, спакою.

Як вы заўважылі, ручнікі бываюць тканыя, вышываныя, з карункавай аздобай. У кожнай мясціне вышыўка была непаўторнай, каларытнай, адметнай, не такой, як у суседзяў, хоць вядома, якой яна б ні была, чалавек заўсёды скажа: "Вось польскі ручнік, вось украінскі, а вось гэта – беларускі".

Лепшыя сучасныя ўзоры ручнікоў дэманструюць адпаведныя часу змены і разам з тым устойлівую захаванасць лакальных, рэгіянальных і нацыянальных

мастацкіх асаблівасцей. Вельмі радасна, што традыцыі нашых продкаў захаваліся і мы маем цудоўную магчымасць бачыць сваімі вачыма прыгажосць працы чалавечых рук.

### 1.2 Арнамент. Сувязь арнамента з ручнікам

Арнаментам называецца ўзор, які характарызуецца рытмічным складам элементаў. Арнамент з’яўляецца рэгулярнай, упарадкаванай структурай. Спецыфіка праяўляецца ў тым, што ў прататыпаў выкарыстоўваюцца не функцыянальныя ўласцівасці , а традыцыі – нацыянальныя ці гістарычныя. У аснове стварэння новых выяў ляжыць выкарыстанне ўжо вядомых матываў, кампазіцыйных рашэнняў, фрагментаў і дэталей з мадыфікацыямі і адрознымі пераўтварэннямі. Узоры арнаментаў, выкананыя ў народным стылі, традыцыйна захоўваюцца ў майстроў, у экспазіцыях і запасных фондах музеяў.

Выяўленчы бок арнаментаў вельмі разнастайны, але ў кожным арнаменце можна вылучыць асноўныя элементы графікі: кропку, лінію, форму. У арнаментах беларускага народа галоўную ролю выконвае лінія, а астатнія элементы падпарадкоўваюцца ёй.

Кампазіцыя арнаментаў беларусаў звычайна характарызуецца простай сіметрыяй і складанай геаметрыяй элементаў і фігур. Элементы ўзораў размешчаны па арментальнай паверхні побач ці на адлегласці адзін ад аднаго, з дакладна заданым рытмам. Пры цэнтральнай кампазіцыі асноўны акцэнт прыходзіцца на цэнтр прамавугольніка або круга, вуглы або перыфірыя прапрацоўваюцца больш дробнымі, менш вылучанымі дэталямі. Форма і памеры арнаментуемай паверхні часцей за ўсё вядомы, таму ўзор павінен быць “упісаны” у заданыя межы. Пры гэтым ўсе элементы арнаменту неабходна размясціць гарманічна, суразмерна [1, с. 208].

Функцыі арнаменту: заклікальная, пазнавальная, выхаваўчая. Усе неслі адну і тую ж глыбінную сімволіку – ахову.

Кожны з ручнікоў меў свой арнамент. На жаль, вучоныя-этнографы і мастацтвазнаўцы толькі пачалі працу па расшыфроўцы гэтых “тэкстаў”. Аднак ужо сёння відавочна, што ручнік – духоўнае ўвасабленне Млечнага шляху, па якім на працягу года рухалася Сонейка. Цікава тое, што і сёння жыве традыцыя: саматканыя ручнікі, якія будуць выкарыстоўваць ці выкарыстоўвалі ў абрадах, пасля сціркі заварочваюць у “трубы”, “кацёлкі”, нагадваючы знаходку археолагаў – старажытныя егіпецкія пісьмёны.

## 1.3 Класіфікацыя арнаментаў

**Арнамент**

↓

**Традыцыйныя спосабы ўзнаўлення**

| **мяккія матэрыялы** | **цвёрдыя матэрыялы** |
|---|---|
| **ткацтва** | **тачэнне** |
| **аплікацыя** | **насечка** |
| **вышыўка** | **гравіроўка** |
| **пляценне** | **разьба** |
| **роспіс** | **выпільванне** |
| **мазаіка** | **далбленне** |
| **штампоўка** | |

# ГЛАВА 2 ДАСЛЕДАВАННЕ ПРЫМЯНЕННЯ РУЧНІКОЎ І ЭЛЕМЕНТАЎ БЕЛАРУСКАГА АРНАМЕНТУ

## 2.1 Анкетаванне навучэнцаў 3 класа

Праведзенае даследаванне дапамагло выявіць узровень ведаў вучняў аб ручніках і арнаменце. Ім былі прапанаваны наступныя пытанні:

1. Ці ёсць у вас дома вышываныя ручнікі?

У 11 навучэнцаў такія ручнікі ёсць, а ў 6 –няма.

2. Як называюцца малюнкі, вышытыя на гэтых ручніках?

Толькі 3 вучні ведаюць, што гэта арнамент.

3. Ці ведаеце вы, што азначаюць гэтыя малюнкі?

Усе вучні напісалі, што не ведаюць.

4. Ці часта ў вашай сям'і карыстаюцца такімі ручнікамі?

Такіх сямей аказалася толькі 6.

Анкетаванне яшчэ раз пацвердзіла актуальнасць выбранай тэмы. (Дадатак 1)

## 2.2 Гутарка з мясцовай майстрыцай

Мы пабывалі ў гасцях ў мясцовай майстрыцы Пашалюк Анастасіі Іванаўны. Яна з задавальненнем згадзілася даць нам інтэрв'ю і адказала на пытанні. Напрыклад:

-Адкуль з'явіліся ў вас гэтыя ручнікі і што яны абазначаюць?

На гэтае пытанне яна адказала так:

-Ручнікі з'явіліся яшчэ з даўніх часоў. З ручніком сустракалі дарагога госця, ручнікамі накрываюцца абразы. Калі маладыя вянчаюцца, то ім пад ногі сцелюць ручнікі на шчасце, на долю. Тым, хто збіраўся ў дарогу, таксама дарылі ручнікі, каб шчаслівай была дарога.

Анастасія Іванаўна паказвала ручнікі, якія ткала яе маці. Таксама паказвала тыя, якімі навязвалі сватоў, накрывалі абразы, або партрэты сваіх бацькоў. Паведаміла, што навучыла яе вышываць маці. Святочнае адзенне сваёй матулі яна зберагла да нашага часу (Дадатак 2).

Паказала работы, вышытыя мулінам на палатне (Дадатак 2).

Яшчэ Анастасія Іванаўна расказала нам, што некаторы час жыла ў Казахстане. Яна і там праславілася сваім майстэрствам, пра яе пісалі мясцовыя газеты. А ў мінулым годзе работы майстрыцы папрасілі ў Германію.

Мяне так зацікавіў расказ Анастасіі Іванаўны, яе работы, што мне вельмі захацелася навучыцца вышываць (Дадатак 2).

## 2.3 Гутарка з настаўнікам абслугоўваючай працы

У нашай школе ёсць цудоўны кабінет абслугоўваючай працы, у якім працуе Святлана Рыгораўна. Я вырашыў даведацца, ці ведае яна пра беларускія ручнікі і арнамент і задаць ёй некаторыя пытанні:

- Адкульу вас гэтыя ручнікі?

- Ручнікі збіраліся многа гадоў. Ёсць ручнікі, якія мне засталіся ад маёй маці, а ёсць ад бабулі, ад суседкі. Так, на працягу многіх гадоў, яны збіраліся ў мяне.

- Якія віды ручнікоў вы ведаеце?

- Ручнікі ёсць розныя. Можна сказаць, што ручнік наш спадарожнік. Ён з чалавекам на працягу ўсяго жыцця. Ёсць ручнікі, прызначаныя для паўсядзённага жыцця. А ёсць такія, якія вешалі ў “чырвоны куток” на абразы. Таксама ёсць ручнікі, якія праводзяць чалавека ў апошні шлях.

- Я гляджу на вашыя ручнікі і бачу на ўсіх розныя ўзоры. Што абазначаюць гэтыя ўзоры?

- Ты правільна заўважыў, на кожным ручніку ёсць свой малюнак. Ён абазначае рознае. Напрыклад, вось ручнік жаночай долі (Дадатак 8). Калі ён вышываўся прыгожымі каляровымі ніткамі – жаночая доля добрая, шчаслівая. Ёсць сімвал куці, дрэва жыцця, сімвал сонца, сімвал маці (Дадатак 8).

Таксама раней вышывалі, калі рыхтавалі прыданае. Дзяўчаты вышывалі сабе розныя ручнікі і з рознай сімволікай. Калі ўзяць ручнік з птушачкамі, то гэта будзе значыць, што ўзнікаюць нейкія пачуцці ў маладых людзей. І калі птушкі глядзяць адна на адну – усё добра, а калі яны адвярнуліся – яны пасварыліся.

Ручнікі, дзе мала вышыўкі, прымяняліся ў паўсядзённым жыцці (Дадатак 3).

- А што, на самай справе ручнікі размаўляюць?

- Так, праўда. Можна глядзець на ручнікі і меркаваць, аб чым думаў той чалавек, які вышываў. Калі малюнак на ручніку яркі, то ў чалавека быў добры настрой. Калі колеры цемнаватыя, то значыць у чалавека штосьці не ладзіцца ў жыцці. Можна па ўзору даведацца, як жылі раней людзі.

## 2.4 Экскурсія ў музей Палесся

Разам з маімі аднакласнікамі наведалі музей Палесся ў горадзе Пінску.

Мы з цікавасцю наведалі ўсе залы музея. З захапленнем разглядвалі зброю, чучалы розных жывёл, але больш за ўсё ўразіла зала народнай творчасці. З зачараваннем слухалі расказ экскурсавода. Яна нам расказала пра рэчы побыту і вялікую ўвагу ўдзяліла ручнікам, іх прызначэнню (Дадатак 4).

### 2.5 Наведванне этнаграфічнага кутка ў сельскім доме культуры і гутарка з Марыяй Уладзіміраўнай і Жанай Іванаўнай

Марыя Уладзіміраўна расказала, што ручнік цікавы не толькі сваім узростам, але і тэхнікай выканання. На выстаўцы ў сельскім доме культуры ёсць вельмі многа цікавых ручнікоў. Яна таксама паведаміла нам, што кожны ручнік мае сваё прызначэнне. Паказала старадаўнія ручнікі, якія вешалі на абразы,якімі накрывалі калыбель маленькага дзіцяці і тыя, якімі карысталіся ў паўсядзённым жыцці (Дадатак 5).

Жана Іванаўна пазнаёміла з ручнікамі, якія выкарыстоўвалі на вяселлях. Расказала, як у даўнія часы святкавалі вяселле (Дадатак 6). А яшчэ паведаміла, што ў сучасны час роля ручніка на вяселлі і ў жыцці чалавека займае значнае месца (Дадатак 7).

Мне вельмі спадабаўся куток народнай творчасці і я праявіў жаданне запісацца на кружок “Вышыванне”.

### 2.6 Конкурс малюнкаў “Ручнік маёй бабулі”

Паказаўшы аднакласнікам ручнікі, пазнаёміўшы іх з гісторыяй узнікнення і відамі ручнікоў, пабываўшы з імі ў музеі Палесся ў горадзе Пінску, пазнаёміўшы іх з відэазапісамі інтэрв’ю Святланы Рыгораўны і Анастасіі Іванаўны я прапанаваў ім правесці конкурс малюнкаў.

### 2.7 Крыжы –абярэгі

Дастаткова крыху прайсці па вёсцы і адразу стане зразумела: тут помняць аб абрадавай значнасці ручнікоў. Аб гэтым вам скажуць крыжы-абярэгі, якія можна тут сустрэць.Ля іх благаслаўлялі дзяцей  у дарогу, страчалі гасцей, маліліся Богу (Дадатак 8)

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Беларускі ручнік адносіцца да тых прадметаў народнага мастацтва, якія належаць і мінуламу, і сучаснасці. Папулярнасць яго нязменная, патрэба ў ім адчуваецца і ў нашыя дні. Па-ранейшаму ручнік абавязкова прысутнічае ў найбольш важныя, пераломныя этапы жыццёвага шляху чалавека. Мы бачым падоўжаны кавалак узорыстай тканіны там, дзе святкуюцца радзіны і вяселле, сустракаем яго і на праводзінах у апошнюю дарогу. Без традыцыйнага набожніка не абыходзіцца і зараз ніводная больш-менш значная выстава народнага мастацтва, бо менавіта ручнік з найбольшай яркасцю ўвасабляе нацыянальныя рысы арнаментальнага мастацтва, высокае майстэрства ткацтва, вышыўкі і вязання.

У працэссе напісання даследчай работы былі вырашаны наступныя задачы:

1. азнаёміўся з літаратурай і матэрыяламі інтэрнэта;
2. выканаў пошуку майстрыц, запісаў іх расказы;
3. азнаёміўся з выкарыстаннем ручнікоў у сем'ях маіх аднакласнікаў;
4. выклікаў цікавасць у вучняў класа даследаваць і вывучаць спадчыну нашых продкаў;
5. прапанаваў настаўнікам распрацоўкі класных і інфармацыйных гадзін па выхаванню павагі да традыцый народнага мастацтва.

Таксама быў атрыманы станоўчы адказ на пастаўленнае ва ўводзінах пытанне. Праведзенае даследаванне паказала, што такую работу праводзіць неабходна.

Аднак нельга не адзначыць, што у наш час засталося вельмі мала людзей, якія памятаюць і выконваюць старынныя звычаі.

Даследаванне дапамагло зразумець думку Ф.Багушэвіча: “Каб не памерці духоўна, каб не прыпынілася сувязь паміж пакаленнямі, неабходна пераймаць вопыт народа як спадчыну”. Вельмі хацелася б , каб у нашай школе вяліся ўрокі па аднаўленню традыцый народнага мастацтва.

Хацеў бы зрабіць вынік, што культурнае адраджэнне беларускага народа немагчыма без вывучэння, захавання і развіцця народнай творчасці.

У выніку хацеў бы сказаць, што дадзенае даследаванне дапамагло мне пазнаць адну са старонак народнай творчасці. У далейшым хацелася б працягнуць работу па вывучэнню народнай творчасці.

## СПІС ВЫКАРЫСТАННЫХ КРЫНІЦ

1. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар; навук. рэд. Я. М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1996. – 208 с.

2. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры: абрады, рытуалы, культурныя традыцыі / Я. Крук. – Мінск: Ураджай, 2000. – 350 с. асвета. − 2009

3. Кухаронак, Т. І. Ручнік у беларускай радзіннай абраднасці: функцыі і сімволіка / Т. І. Кухаронак // Ручнік у прасторы і часе: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 19 − 20 ліст. 1998 г. / агул. рэд. В. А. Лабачэўскай. – Мінск: БелІПК, 2000. − 188с. − С. 103 – 107.

4. Лабачэўская, В. А. Повязь часоў – беларускі ручнік: альбом / В. А. Лабачэўская. – Мінск: Беларусь, 2009. − 298 с.

5. Леанавец, Н. Матулін ручнік: сцэнарый вечарыны / Н. Леанавец // Роднае слова. − 1998. − № 10. – С. 132 – 136.

6. Пармон, Л. Па ручніку, што з роднай хаты, мы пазнаём сваю Радзіму…: сцэнарый вечарыны /Л. Пармон, Л. Сахарэвіч, Н. Трыгубовіч // Роднае слова. – 2006. − №7. – С. 67 – 70.

7. Сахута, Я. М. Народныя мастацкія рамёствы Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 2001. – 167 с.

8. Фадзеева, В. Беларускі ручнік / В. Фадзеева. – Мінск: Полымя, 1994. – 327 с.

# ДАДАТКІ

**ДАДАТАК 1**

## Анкетаванне навучэнцаў 3 класа



**ДАДАТАК 2**

# Гутарка з мясцовай майстрыцай





ДАДАТАК 3

# Гутарка з настаўнікам абслугоўваючай працы



ДАДАТАК 4

# Экскурсія ў музей Палесся



**ДАДАТАК 5**

## Наведванне этнаграфічнага кутка ў сельскім доме





**ДАДАТАК 6**

# Вяселле ў даўнія часы





**ДАДАТАК 7**

# Вяселле ў сучасны час





ДАДАТАК 8

# Крыжы – абярэгі



